Самадзейная творчасць

Рыгор Шаура

# Памяць абавязвае...

**Ваенная тэма ў самадзейнай выяўленчай творчасці**



М. Засінец. Партызан. Алей, 1972.

В. Жарнасек. Партызанскі бой. Алей, 1977.

Ю. Сергіенка. Безыменная вышыня. Алей, 1984.

К. Чубанаў. Бой прайшоў не дзеля славы. Алей, 1984.

Г. Ганчаронак. Фашысцкі налёт. Алей, 1984.



Тэма Вялікай Айчыннай вайны глыбока раскрыта ў савецкай літаратуры, кінематографе, у выяўленчым і тэатральным мастацтве. Вось ужо на працягу больш чатырох дзесяткаў гадоў яна жывіць мастацкую самадзейнасць і, у прыватнасці, аматарскую выяўленчую творчасць. Многія самадзейныя мастакі ведаюць пра ліхалецце не са слоў, яны самі ваявалі і з перамогай вярнуліся дадому. У іх творах мы заўсёды адчуваем жывую праўду таго часу. Па дарогах мінулай вайны прайшлі не толькі салдаты, але і тысячы, сотні тысяч дзяцей, падлеткаў, жанчын. І яны маюць што сказаць нашчадкам.

Звяртаюцца да трагічных старонак нашай гісторыі і тыя, хто нарадзіўся і вырас пасля Перамогі. Натуральна, уяўленне пра вайну фарміруецца ў іх на аснове гістарычных і літаратурных матэрыялаў, кінафільмаў, расказаў дзядоў і бацькоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Аматарская творчасць уяўляе сабою даволі складаную мадэль творчага працэсу. Некаторыя тэарэтычныя аспекты гэтай праблемы ўжо разглядаліся на старонках часопіса (Мастацтва Беларусі, № 2, 1984). Варта яшчэ раз нагадаць, што творы самадзейных аўтараў нельга ацэньваць паводле крытэрыяў прафесійнага мастацтва. Па самой сутнасці, задачах і прыродзе функцыяніравання гэтыя мастацкія пласты шмат у чым розняцца. Перад самадзейнай творчасцю як масавым сацыяльна-культурным рухам працоўных не стаіць прамая задача стварэння мастацтва ў шырокім разуменні гэтага слова. Менавіта прыродны дар, захапленне красою, бескарыслівае творчае працалюбства дазваляюць чалавеку без спецыяльнай, акадэмічнай падрыхтоўкі ўзняцца да стварэння сапраўдных узораў выяўленчага мастацтва, перадаць адметнымі выяўленчымі сродкамі вобразнае бачанне навакольнага свету. Аматарскае выяўленчае мастацтва цягнецца да ўстойлівых мастацка-вобразных канонаў і эстэтычных уяўленняў традыцыйнага народнага мастацтва, а таксама — да вядомых прафесійных, акадэмічных правілаў і прыёмаў. Такім чынам, на выстаўках самадзейнага мастацтва гледачы заўсёды сустракаюцца з работамі, якія арыентаваны на ўзоры прафесійнага мастацтва, і выяўленчым «прымітывам». Але каштоўнасць твора, як вядома, не вызначаецца той ці іншай так званай стылістычнай скіраванасцю. Важна іншае — ці суперажывае яму глядач.

У самадзейнай творчасці ваенная тэматыка раскрываецца ў розных жанрах з дапамогай разнастайных вобразных сродкаў. Часта сустрэнеш батальныя сцэны. Мастакі гранічна падрабязна малююць ваенныя эпізоды — наступленне савецкіх войскаў, бітвы ў паветры і на моры, партызанскія баі ў тыле ворага. Увасабляючы масавыя сцэны, якія часам перарастаюць у цэлыя тэматычныя панарамы, самадзейныя мастакі імкнуцца падкрэсліць разнастайнасць ваенных падзей. Часта выкарыстоўваюць сімволіку, метафару, гратэск. Многія аўтары раскрываюць змест не ў прасталінейным пераказе падзей, а праз алегарычнае іх асэнсаванне. У вобразнай канве твора выяўляецца псіхалагічны аспект.

Тэма вайны своеасабліва праламляецца і ў партрэце. На працягу апошняга дзесяцігоддзя на абласных і рэспубліканскіх выстаўках экспанаваліся цэлыя серыі партрэтаў герояў Вялікай Айчыннай вайны, франтавікоў, былых партызанаў і падпольшчыкаў. Парадныя партрэты праслаўленых воінаў з усімі рэгаліямі, баявымі ўзнагародамі і партрэтныя кампазіцыі, у якіх паказана не толькі канкрэтная асоба, але і нейкая баявая аперацыя. Аўтары спрабуюць намаляваць партрэт-карціну, насычаюць яе інфармацыяй, імкнуцца нават зберагчы паслядоўнасць расказу.

Больш за сорак гадоў прайшло з таго часу, як прагрымелі салюты Перамогі. Адбудаваліся гарады, вёскі, зараслі кветкамі і травой акопы, траншэі. Але не суцішыць апаленай вайною народнай памяці.

Своеасаблівым летапісам народнага подзвігу былі работы, экспанаваныя на Рэспубліканскай выстаўцы народнага мастацтва і самадзейнай творчасці, прысвечанай саракагоддзю Вялікай Перамогі (1985). Запала ў памяць палатно «Чырвоны снег» ветэрана вайны П. Дзіардзійчука. На вялікай па памеру карціне паказаны рукапашны бой партызанаў з гітлераўскімі карнікамі. Яе насычаны барвова-чырвоны каларыт актыўна падкрэслівае асаблівую напружанасць бою, смяротнасць схваткі з ворагам. Алегарычная назва карціны ўзмацняе драматызм адлюстраванай сітуацыі. Чырвоны снег — гэта снег, шчодра паліты крывёю народных мсціўцаў.

Удзельнік баёў за Кёнігсберг С. Чэпікаў стварыў карціну-панараму, прысвечаную штурму савецкімі войскамі гэтага горада-крэпасці. Аўтар дэталёва перадаў падзеі красавіка 1945 года, калі ішоў штурм. Варта адзначыць, што празмерная насычанасць палатна дзейнымі асобамі, перагружанасць кампазіцыйнай структуры, шматпланавасць ускладняюць працэс успрымання твора гледачамі. Ра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зам з тым карціна набывае рысы гістарычнага апавядання. У гэтай рабоце псіхалагізм вобразаў выяўляецца гратэскна. Часам аўтар наўмысна гіпертрафіруе, скажае твары і фігуры фашысцкіх салдатаў і афіцэраў, выказваючы такім чынам асабістую агіду і нянавісць да ворагаў.

Жывапісец Д. Крупеня — удзельнік партызанскай барацьбы. Карціны мастака таксама напісаны паводле дакументальных матэрыялаў і маюць канкрэтную геаграфічную прывязку.

Незабыўны, цяжкі момант — прарыў працяглай блакады партызанскіх брыгад Лепельска-Ушацкай зоны ў 1944 годзе паказвае Д. Крупеня ў карціне «Выхад з блакады». Сотні партызанаў у імклівым парыве праз град асколкаў і куль рынуліся са шчыльнага вогненнага кола ўперад па топкім лясным балоце.

Эпізоды баявых дзеянняў увасобілі С. Смяюха («Наступленне»), П. Калеснікаў («На абарону Севастопаля»), М. Чарвякоў («З дакладам да партызан»), М. Капітанчук («Перад штурмам Берліна») і іншыя.

Падзеі ваенных гадоў трактуюцца і як выпрабаванне духу, волі чалавека, выяўленне яго лепшых якасцей — мужнасці, стойкасці, адданасці сваёй Радзіме, любові да яе. Гэтыя рысы, уласцівыя савецкім людзям, падкрэслены ў работах Г. Ганчаронка («Няскораныя»), Р. Колчына («Маці», «Паядынак»), Д. Крупені («Апошні бой»), М. Шчаўканогава («За Радзіму») і іншых мастакоў.

У карціне «Няскораныя» Г. Ганчаронак паказвае, як фашысцкія палачы расстрэльваюць старога і хлопчыка. На грудзях у старога шыльда з надпісам: — «Партызан». З горда ўзнятай галавой глядзіць ён у твар смерці, усведамляючы яе непазбежнасць. Яго непахісная вера ў тое, што ні яго фізічная смерць, ні смерць гэтага хлопчыка не ўратуюць гітлераўскіх забойцаў ад непазбежнай расплаты за ўсе іх злачынствы, дае яму сілы быць спакойным і бясстрашным.

Але часцей мастакі-аматары паказваюць вайну як народнае гора. Душэўным болем, безвыходным трагізмам напоўнена карціна Д. Сталярова «Трагедыя Каменкі». Варта сказаць, што аўтар гэтага палатна вядомы ў рэспубліцы як адзін са старэйшых разьбяроў. Названы твор — яго першая жывапісная работа. Яна прадэманстравала незвычайныя здольнасці майстра і ў галіне станковай карціны. Асновай для сюжэта паслужыў дакументальны факт знішчэння фашысцкімі карнікамі вёскі Каменкі.

Велізарнай эмацыянальнай сілай уздзейнічае на гледачоў і графічная кампазіцыя Л. Агеевай «Боль і мужнасць», якая экспанавалася на мастацкіх выстаўках у сярэдзіне 1970-ых гадоў. Аўтар расказвае, як гітлераўцы выгналі з родных хат дзяцей, жанчын, старых і ў заснежаным полі ўчынілі крывавую расправу. На пярэднім плане — падлетак, вочы якога напоўнены жахам.

У самадзейнай выяўленчай творчасці шматгранна адлюстравана і гераічная праца савецкага народа ў гады вайны. «Усё для фронту, усё для перамогі!» — і на працоўную вахту станавіліся старыя, падлеткі, жанчыны.

Героям тылу прысвяцілі свае работы П. Букасаў, П. Баранаў, П. Гольцаў, М. Засінец, М. Шчаўканогаў, М. Чарвякоў і іншыя. Яны не толькі ўвасабляюць сам працэс працы, але і спрабуюць узвесці на найвышэйшы п'едэстал асобу чалавека-грамадзяніна, патрыёта.










Суровы ваенны час паўстае на палатне П. Букасава «Дзеці вайны». ...Чараду фурманак з нарыхтаваным лесам вядуць падлеткі да чыгуначнага паўстанка. Вялізныя штабялі дроў уздоўж рэек, дым манеўровых паравозаў... Перададзены сам рытм вялікай і напружанай працы.

Творча пераасэнсоўвае эпізоды і падзеі ваеннага часу і мастак-аматар М. Чарвякоў. Ён спрабуе даць героям вострыя псіхалагічныя характарыстыкі. Да прыкладу, можна згадаць такія карціны, як «Лёс салдата», «Канец здрадніка». Цікавая па кампазіцыі карціна «Лёс салдата». Чалавек вярнуўся з фронту, прыйшоў да сваёй спаленай ворагамі хаты і застыў у доўгім журботным маўчанні. Перад яго вачыма быццам паўсталі малюнкі незваротных дзён зруйнаванага вайною сямейнага шчасця.

У карціне «Мірны час» М. Чарвякоў увасабляе дзяцей, якія ўважліва слухаюць расказ ветэрана на месцы былых баёў. Яшчэ сёння не зарослыя траншэі, акопы — нямыя сведкі гісторыі — надаюць успамінам рэальнасці.

Мастакі-аматары з асаблівай увагай ставяцца да людзей, якія прайшлі нялёгкімі баявымі дарогамі. С. Мірзаян стварыў цэлую галерэю партрэтаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны («Партрэт М. Мормуля, былога камандзіра партызанскай брыгады «Буравеснік», «Партрэт ветэрана вайны У. Малафеева» і іншыя). У гэтых работах (малюнак пяром, тушшу) відавочнае імкненне аўтара раскрыць унутраны свет партрэтуемых.

Р. Колчын вырашае вобраз праслаўленага палкаводца генерала Даватара, ў форме партрэта-карціны. На фоне кампазіцыйна пабудаванай сцэны паветранага бою савецкага самалёта з эскадрылляй варожых знішчальнікаў малюе Героя Савецкага Саюза А. Гараўца Я. Алейнікаў. Спроба сінтэзу партрэтнага вобраза з фрагментам баявога эпізоду надае творам больш глыбокага зместу.

У раскрыцці канкрэтна зададзенай тэмы самадзейныя мастакі вельмі часта ўжываюць прыёмы так званага камбінаванага мантажу. Такія дэталі, як старыя фотаздымкі, адзенне ці асабістыя рэчы загінуўшых у час вайны, узнагароды, сцэны даваеннага, мірнага жыцця лагічна звязваюцца па зместу з партрэтнымі вобразамі — жанчыны-ўдавы, маці, што не дачакалася з фронту сыноў, ветэрана вайны. Для гэтых людзей ліхалецце — не забытая гісторыя, не далёкае мінулае, а сённяшні несціханы боль, душэўныя і фізічныя раны. У сваіх думках, успамінах яны падзяляюць з тымі, хто аддаў сваё жыццё за мірнае неба, усё, што блізкае сэрцу,— красу палявых кветак, пах духмянага жытняга хлеба, сонечнае святло. Згадаем карціны «Успаміны» Ю. Сергіенкі, «Памяць» В. Дабраквашына і «Памяць» В. Ярашэвіча.

З ваеннай тэмай звязаны і многія пейзажы. Тут бачыш дэталі, якія рэжуць вока балючымі напамінамі (карціны «Дот» Л. Трахалёвай», «Безыменная вышыня» Ю. Сергіенкі, «Партызанскімі сцежкамі» В. Жарнасека і іншыя).

Сумленне і памяць абавязваюць людзей не забывацца пра цяжкія ваенныя гады і тыя раны, што нанеслі яны нашай зямлі. Сваё адметнае слова пакідаюць у летапісе Вялікай Айчыннай і мастакі-аматары.







П. Дзіардзійчук. Чырвоны снег. Алей, 1978.

В. Шаўчэнка. Партызанскае вогнішча. Алей, 1985.

В. Гутнік. Дзеці партызанаў. Алей, 1984.